

МУЗЕЙ — РАВЕСНІК ВЫЗВАЛЕННЯ 5

ГРАМАДСКІ ДОМ З КРАЮ 12






Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. СУБОТА № 205 (29072)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл РУСЫ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці:**

*«Заўсёды трэба ставіць сябе на месца чалавека, які прыходзіць па дапамогу. Прыёмы грамадзян паказваюць, што людзі гатовы да дыялогу. Яны не перакладаюць адказнасць на прадстаўнікоў улады, яны зацікаўлены ў паляпшэнні якасці свайго жыцця. Жыхары прыходзяць з разумнымі прапановамі. Сутнасць такіх прыёмаў — зблізіць людзей у вырашэнні пытанняў на месцах».*

# УЗАЕМНЫ СТРАТЭГІЧНЫ ІНТАРЭС

## Калі ў Беларусі будзе казахстанская нафта і чаму прамкааперацыя — у прыярытэце

**У Нур-Султане ўчора быў дзень афіцыйных перагавораў і глабальных дамоўленасцяў. Па выніках сустрэч Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Казахстана Касым-Жамарта Такаева ў вузкім і пашыраным складах прагучала, што ў краін падобныя не толькі гісторыя, але і каштоўнасці, і погляд на будучыню. Здаецца, розніца ў часе — адзінае разыходжанне паміж Беларуссю і Казахстанам, ды і тая не перашкаджае кіраўнікам дзяржаў будаваць планы па збліжэнні.**

### НА НАДЗЕЙНЫМ ФУНДАМЕНЦЕ

Размову з Касым-Жамартам Такаевым Аляксандр Лукашэнка пачаў з заявы, што Беларусь заўсёды будзе надзейным партнёрам для Казахстана.

«Нашы адносіны з Казахстанам ідуць углыб дзесяцігоддзяў, стагоддзяў. Мы заўсёды, асабліва ў савецкі перыяд, былі блізкія. Нашы эканомікі заўсёды былі ўзаемадапаўняльныя, гэта стварае новыя магчымасці для нас і цяпер. Ва ўсім, што мы вырабляем, мае патрэбу наш дружалюбны Казахстан. Што вырабляеце вы, мы гатовы купляць з вялікім задавальненнем. Склалася добрая перспектыва. Існуючы фундамент, які створаны за гады незалежнасці, дарагога варты», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2



Фота БелТА.



Фота БелТА.

# Бізнес на гарбузіках

У Лельчыцкім раёне мясцовыя жыхары навучыліся зарабляць не толькі на зборы ягад і грыбоў, але і на... гарбузах, якія на поўдні Беларусі добра родзяць. Прычым не на саміх жоўтых пладах, а менавіта на семачках-гарбузіках, высушаных натуральным спосабам, якія ў іх з ахвотай купляюць і свае, і прыезджыя прадпрымальнікі. Працуюць на семачкавай вытворчасці сем'ямі. На гэтым фота, напрыклад, жыхар аграгарадка Ударнае Уладзімір ЛІСІЦКІ прывёз прычэп гарбузоў на перапрацоўку дачцэ, якая жыве ў вёсцы Сініцкае Поле.

## КОРАТКА

• Нацыянальны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні XXVII Дня беларускага пісьменства, які пройдзе ў Бялынічах 6 верасня 2020 года, створаны пастановай Савета Міністраў. Кіраўніком аргкамітэта прызначаны намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка.

**• 250 тысяч замежнікаў наведалі Гродна ў бязвізавым рэжыме за тры гады.**

• Авіякампанія «Міжнародныя авіялініі Украіны» з 16 лістапада спыніць выкананне рэйсаў у Мінск.

**• Нацыянальны аэрапорт Мінск з 1 лістапада павышае кошт паслугі трансферу — яна складзе Br40 (раней Br30).**

• У Гомелі каля Інстытута механікі металапалімерных сістэм імя У. А. Белага адкрылі інавацыйны сквер.




ISSN 1990 - 763X

19205


Рынак працы

# Атрымаць новую спецыяльнасць праз тры месяцы...

Беспрацоўным дзяржава прапануе перанавучанне



Фота БелТА.

**Як і дзе можна прайсці прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павысіць сваю кваліфікацыю або асвоіць адукацыйныя праграмы навучальных курсаў? Пра гэта падчас анлайн-канферэнцыі, прысвечанай прафесійнай падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы беспрацоўных грамадзян, на сайце БелТА расказалі прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Мінгарвыканкама.**

**Якога роду прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі могуць прайсці беспрацоўныя грамадзяне?**

**Алег Лісейчыкаў:**

— Беспрацоўныя могуць прайсці перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі на базе Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Напрыклад, у нас можна атрымаць другую вышэйшую адукацыю па спецыяльнасцях «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных сістэм», «лагістыка», «бухгалтарскі ўлік і кантроль у прамысловасці», «псіхалогія».

СТАР. 4

# УЗАЕМНЫ СТРАТЭГІЧНЫ ІНТАРЭС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт падкрэсліў, што беларусы і казахстанцы як блізкія людзі, блізкія сябры, заўсёды знойдуць рашэнне па ўсіх пытаннях. Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу, што Беларусь і Казахстан разам з Расіяй знаходзяцца ў цэнтры інтэграцыйных працэсаў. І без Казахстана, дадаў ён, сёння не абыходзіцца ні адзін кірунак інтэграцыі. Таксама Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Казахстан у часы першага Прэзідэнта з'яўляўся ініцыятарам многіх інтэграцыйных працэсаў.

«І мне вельмі прыемна канстатаваць, што вы ў вельмі няпросты час прынялі руль кіравання гэтай велізарнай рэспублікай, прытрымліваецеся курсу інтэграцыі ў эканоміцы нашых краін, дружбы нашых народаў», — звярнуўся беларускі лідар да казахстанскага калегі.

Касым-Жамарт Такаеў у сваю чаргу назваў візіт Аляксандра Лукашэнкі жаданай падзеяй для Казахстана і добрай магчымасцю пацвердзіць абсалютна дружалюбны характар узаемаадносін паміж краінамі, надаць сур'ёзны імпульс дзеласому супрацоўніцтву.

На перагаворах у пашыраным фармаце беларускі лідар яшчэ раз падкрэсліў: «Узровень беларуска-казахстанскіх адносін сёння ў поўнай меры адпавядае стратэгічным інтарэсам нашых краін. Гэта вынік карпатлівай шматгадовай работы, які дае магчымасць будаваць сур'ёзныя планы на будучае». Мінск і Нур-Султан напрацавалі станоўчы вопыт узаемадзеяння на ўсіх узроўнях, а ступень даверу такая, што краіны адкрыта абмяркоўваюць любыя пытанні.

«Добрую аснову для маштабнага супрацоўніцтва ствараюць падабенства прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і ўзаемнае імкненне ўмацоўваць рэальны сектар эканомікі. Таму мы зрабілі асаблівы акцэнт на пашырэнні дыялогу менавіта ў эканамічнай сферы, таму што іншых праблемных пытанняў — у сферах палітыкі, ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, дыпламатыі — у нас практычна няма. Нашы погляды на асноўныя праблемныя пытанні міжнароднага парадку дня аднатыпныя або падобныя», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Лідары краін па выніках перагавораў у Нур-Султане прынялі сумесную заяву. Акрамя таго, па выніках сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў урады заключылі пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне міграцыі. Аб супрацоўніцтве і ўзаемадзеянні дамовіліся Аператыўна-аналітычны цэнтр пры Прэзідэнце Беларусі і Камітэт нацыянальнай бяспекі Казахстана. Міністэрствы замежных спраў падпісалі план супрацоўніцтва на 2020—2021 гады. Пагадненне аб супрацоўніцтве заключылі Следчы камітэт Беларусі і Генеральная пракуратура Казахстана. Дзяржаўны камітэт па маёмасці Беларусі і Міністэрства юстыцыі Казахстана падпісалі пагадненне па пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці. Заключана пагадненне паміж Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Міністэрствам лічбавага развіцця, абароннай і аэракасмічнай прамысловасці Казахстана аб супрацоўніцтве ў галіне абмену данымі дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі.

Пасля цырымоніі падпісання дакументаў Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што перагаворы прайшлі ў абсалютна дружалюбнай атмасферы і мелі дзелавы, даверны характар.

«Перакананы, іх вынікі нададуць новую пазітыўную дынаміку паглыбленню стратэгічнага партнёрства Мінска і Нур-Султана», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

## АД ГАНДЛЮ — ДА КААПЕРАЦЫІ

Прыярытэтам эканамічнага супрацоўніцтва Беларусь і Казахстан вызначылі прамысловую кааперацыю.

«Мы ад простага гандлю, які ў нас даволі шырока прадстаўлены і развіты, пераходзім да кааперацыйных сувязяў. Сёння тут паспяхова функцыянуюць сумесныя прадпрыемствы па зборцы беларускай тэхнікі. Мы дамовіліся аб павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці камбайнаў, а таксама вызначылі стратэгію далейшай работы па выпуску тэхнікі Мінскага трактарнага завода ў Казахстане», — расказаў Аляксандр Лукашэнка журналістам па выніках перагавораў. Ён адзначыў, што разам з прамысловай кааперацыяй краіны валодаюць неабходным патэнцыялам для нарошчвання эфектыўнага супрацоўніцтва ў іншых галінах эканомікі: сельскай гаспадарцы, транспарце і лагістыцы, дарожным будаўніцтве, высокіх тэхналогіях, мірным асваенні космасу. Традыцыйна беларускі бок цікавяць металы, збожжа, бавоўняная валакно, нафтапрадукты, якія вырабляюцца ў Казахстане.

«Беларусь удзяляе асаблівую ўвагу пытанню дыверсіфікацыі паставак нафты. Таму мы зацікаўлены ў імпарце гэтай сыравіны з вашай краіны», — звярнуў увагу Прэзідэнт. Ён анансаваў правядзенне кансультацый з Расіяй, паколькі транзіт, калі гэта стане магчыма, казахстанскай нафты будзе ажыццяўляцца трубаправодным транспартам праз яе тэрыторыю, і выказаў спадзяванне на дасягненне згоды.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што для Беларусі Казахстан з'яўляецца адным з асноўных партнёраў па аб'ёме тавараабароту сярод краін СНД. За апошнія гады ўзаемны гандаль значна ўзрос і па выніках 2018 года дасягнуў амаль 900 мільёнаў долараў. Сёлета станоўчая дынаміка прадоўжылася.

«І ўсё ж відавочна, што гэта лічба не адпавядае ні маштабам Казахстана, ні магчымасцям Беларусі. Перакананы, пераадолець сумеснымі намаганнямі планку ў памеры мільярд долараў — рэальна. І мы намецілі такія перспектывы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Сярод іншага прэзідэнты дамовіліся прапрацаваць пытанне аб стварэнні сумеснага венчурнага фонду, які зоймецца развіццём перспектыўных кампаній і стартапаў. Беларусь і Казахстан разгледзяць і магчымасць правядзення форуму міжрэгіянальнага супрацоўніцтва.

Падагульняючы перагаворы, Аляксандр Лукашэнка падзякаваў свайму казахстанскаму калегу за канструктыўны падыход і гатоўнасць прыкласці ўсе намаганні на карысць дзвюх краін і народаў.

«А казахстанскаму народу хачу сказаць: вы правільна зрабілі, што звязаліся з Беларуссю. Мы людзі абавязковыя, ніколі нікога не падводзілі і вас таксама ніколі не падвядзём. Ведайце, што там, у цэнтры Еўропы, ёсць і ваша зямля», — заявіў Прэзідэнт.

## СЯБРОЎСТВА, ПРАВЕРАНАЕ ЧАСАМ

Аляксандр Лукашэнка запрасіў Касым-Жамарта Такаева наведаць з афіцыйным візітам Беларусь у 2020 годзе і адзначыў, што гэта дасць магчымасць пракантраляваць выкананне дамоўленасцяў і выкананне падпісаных у Нур-Султане пагадненняў.

«Казахстан для нас — важны, правераны часам сябар, з якім Беларусь выбудоўвае стратэгічныя, саюзніцкія і братэрскія адносіны», — заявіў Прэзідэнт.

«Па волі лёсу гісторыяй дадзена права, магчымасць тром рэспублікам (Расія, Беларусь, Казахстан. — **Заўвага рэд.**) постсавецкай прасторы быць у авангардзе інтэграцыі. Ад нас шмат чакаюць народы былога Савецкага Саюза, і мы не можам не спраўдзіць іх надзей», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка ў Нур-Султане сустрэўся і з першым Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым. Той напярэдадні вярнуўся з Японіі, дзе прымаў удзел у цырымоніі інтранізацыі імператара. Сустрэчу з Прэзідэнтам Беларусі, паводле яго слоў, ён ні ў якім разе не хацеў адмяняць. Нурсултан Назарбаеў таксама лічыць, што краінам трэба нарошчваць супрацоўніцтва і ўзаемны гандаль.

«У нас ёсць што прапанаваць адзін аднаму», — падкрэсліў ён. — Прастора ЕАЭС, дадаў палітык, павінна адкрываць дарогу ў тым ліку і для развіцця двухбаковага супрацоўніцтва, а не будаваць перашкоды».

«Вядома, гэта нядобра, — адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы хочам купіць у вас, дапусцім, вуглевадароды, нафту, але не можам ніяк дамовіцца. Мы вырашылі, што з абодвух бакоў будзем падціскаць нашых саюзнікаў».

**Паводле БелТА.**

# Горкі вопыт у дапамогу іншым

## Гібель непаўналетняга ад передазіроўкі наркотыкамі апошні раз была ў 2014 годзе

**На такія звесткі звярнула ўвагу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА на сустрэчы з маці асуджаных па артыкуле 328 Крымінальнага кодэкса. Размова працягвалася амаль дзве гадзіны.**



Фота БелТА.

«Кіраўнік дзяржавы ў курсе ўсяго таго, што мы з вамі абмяркоўвалі раней. Усе пытанні адпрацоўваюцца самым дбайным чынам. Бо для таго, каб прымаць рашэнні, патрэбна сур'ёзная аналітыка. Трэба сказаць, што ўжо значна знізілася колькасць злачынстваў сярод непаўналетніх. Калі ў 2014 годзе ў медыцынскія ўстановы з перадазіроўкай паступіў 1351 чалавек, з іх 223 непаўналетнія, то ў 2018-м — 327, з іх 11 непаўналетніх. У нас гібель непаўналетняга ад перадазіроўкі наркотыкамі апошні раз была ў 2014 годзе», — перадае словы Наталлі Качанавай БелТА.

Па звестках ААН, смяротнасць ад перадазіроўкі псіхаактыўнымі рэчывамі ў Беларусі складае 4,6 на мільён чалавек. Для параўнання: у Літве — 64, Расіі — 76, Швецыі — 95, Эстоніі — 131, а ў ЗША — 329.

«Вынікі ў нас, вядома, ёсць у гэтай рабоце, але вастрыня праблемы не здымаецца», — звярнула ўвагу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

На яе думку, у прафілактычную работу павінны быць уключаны і сям'я, і ўстановы адукацыі, міністэрствы і ведамствы. Наталля Качанава падкрэсліла, што праблема ўцягвання непаўналетніх ва ўжыванне і распаўсюджванне наркотыкаў заключаецца не толькі ў пытаннях выхавання ўнутры сям'і: «Сёння неабходная агрэсіўная прафілактычная работа. Чым больш аб праблеме будуць ведаць дзеці, бацькі, настаўнікі ў школах, тым будзе больш эфекту ад гэтага. Трэба гаварыць і паказваць гэта, па-іншаму не атрымаецца».

Прысутныя на сустрэчы папрасілі звярнуць увагу на пытанні ўвядзення адзіных умоў утрымання ў калоніях, разгледзець магчымасць больш працяглых тэлефонных размоў заключаных са сваякамі, прапанавалі ўнесці змены ў частку 4 артыкула 328.

Вопыт маці-актывістак кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта прапанавала выкарыстоўваць у прафілактычнай рабоце.



## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

Предмет аукциона:
**Центр розничного бизнеса (помещение финансового назначения),** общ. пл. **292 кв. м**, инв. № **200/D-153229**, по адресу: **г. Витебск, ул. Кирова, 6-37.** Начальная цена с НДС 20 % – **558 240,00 бел. руб.**
**Дополнительная информация:** при приобретении предмета аукциона, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона на сумму 33 725,76 бел. руб. с НДС 20 %. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора торгов **www.cpo.by**
**Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество** установленны в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 20** календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **20** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**.
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 19.09.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **15.11.2019** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.11.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |



Блізкая ўлада

# Звароты напрамую

**Супрацоўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта працягваюць праводзіць выязныя прыёмы грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у рэгіёнах краіны. На наступным тыдні яны будуць працаваць па такім графіку:**

**29 кастрычніка ў Светлагорску** з 15.00 прыём будзе ажыццяўляць **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА.** У гэты ж дзень **з 10.00 у Гарадоцкім раёне** будзе працаваць **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ, а з 11.30 у Баранавічах і Баранавіцкім раёне — памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль МАРКЕВІЧ.**

**30 кастрычніка памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ з 10.00** будзе працаваць **у Валожынскім раёне. 31 кастрычніка ў Пружанах з 11.00** грамадзян выслухае **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ.**

**Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлю КАЧАНАВУ** чакаюць **1 лістапада з 11.00 у Расонах.** Таксама **1 лістапада з 11.00 у Глыбоцкім раёне** праводзіць прыём **начальнік галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Андрэй МАТЭЛЬСКІ, а ў Воранаўскім раёне з 11.00 — першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб — начальнік упраўлення пісьмовых і электронных зваротаў Крысціна ПОБАЛЬ.**

Выбары-2019

# АЛЬБО НА РАБОТУ, АЛЬБО Ў ПАРЛАМЕНТ

## Чаму кандыдаты падчас перадвыбарнай гонкі сыходзяць з дыстанцыі?

**Рэгістрацыя аднаго з 560 зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты скасавана, некалькі кандыдатаў знялі свае кандыдатуры з далейшага ўдзелу ў выбарах. Такая інфармацыя прагучала ў відэазвароце старшыні Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэферэндумаў Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ на сайце ЦВК.**

Кандыдаты пакідаюць выбарчую гонку перш за ўсё таму, што некаторыя з іх не ведаюць усіх умоў, у якія ставіць грамадзяніна яго становішча зарэгістраванага кандыдата.

«Неабходнасць сысці ў водпуск — сацыяльны ці чарговы — пакольккі на працягу месяца да дня выбараў кандыдат у дэпутаты мусіць знаходзіцца па-за месцам работы. Выключэнне — старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі». Лідзія Ярмошына растлумачыла, што некаторыя кандыдаты не былі гатовыя выконваць такое патрабаванне, не хочуць пакідаць рабочае месца і знімаюцца з рэгістрацыі.

«Тым не менш спадзяюся, што большая частка пройдзе ўвесь гэты шлях і іх прозвішчы будуць уключаны ў бюлетэні для галасавання. Ужо больш за 55 працэнтаў кандыдатаў — больш за трыста — адкрылі фінансавыя рахункі для пералічэння сродкаў у асабістыя выбарчыя фонды», — дадала старшыня Цэнтрвыбаркама.

Максімальны памер кожнага фонду не павінен перавышаць тысячы базавых велічынь, што складае 25 500 рублёў. Мінімальны памер узносаў неабмежаваны: грамадзяне могуць уносіць у выбарчы фонд кандыдата не больш за пяць базавых велічынь, а арганізацыі і юрыдычныя асобы — не больш за дзесяць. Фонд цалкам альбо часткова можа быць утвораны самім прэтэндэнтам на месца ў парламенце.

Сродкі фонду накіроўваюцца перш за ўсё на стварэнне друкаванай прадукцыі, набыццё дадатковага эфірнага часу і газетнай плошчы, аплату іншых рэкламных мерапрыемстваў. Раздача падарункаў альбо матэрыяльных каштоўнасцяў падчас перадвыбарных мерапрыемстваў забаронена, падкрэсліла кіраўнік камісіі.

Па яе словах, частка кандыдатаў падала заявы на правядзенне грамадска-масавых мерапрыемстваў. Больш за ўсё ахвотных правесці мерапрыемства на адкрытым паветры — у Мінску, Гомельскай і Гродзенскай абласцях. А вось у Магілёўскай, нягледзячы на «конкурс» пяць чалавек на месца, — толькі адна заяўка. Праўда, адразу на 130 мерапрыемстваў. Малаактыўныя пакуль і кандыдаты ў дэпутаты на тэрыторыі Віцебскай вобласці.

«Усе мерапрыемствы, якія праводзяцца на вуліцах, адбываюцца дастаткова свабодна. Кандыдаты ў дэпутаты проста даводзяць да ведама мясцовых уладаў, дзе і калі будуць праводзіць мерапрыемства. Як правіла, месцы заяўляюцца як «рэзерв», як магчымасць праводзіць там пікеты ці сустрэчы з выбаршчыкамі», — адзначыла Лідзія Ярмошына. Запрасіць выбаршчыкаў на «спатканне» кандыдаты могуць з дапамогай сацыяльных сетак і друкаванай прадукцыі.

Тым часам сустрэчы ў закрытых памяшканнях больш за ўсё плануюць прэтэндэнты на дэпутацкі мандат ад Мінскай і Гродзенскай абласцей. Інфармацыя аб гэтых сустрэчах павінна даводзіцца да ведама выбаршчыкаў акруговымі выбарчымі камісіямі, у сродках масавай інфармацыі ці на сайтах мясцовых органаў улады, праз аб'явы на інфармацыйных дошках.

Запрашэнні на выбары і інфармацыйныя матэрыялы выбаршчыкі атрымаюць 7 лістапада, за дзесяць дзён да выбараў. Перыяд датэрміновага галасавання пачнецца 12 лістапада. Выбары ў Палату прадстаўнікоў прызначаны на нядзелю, 17 лістапада.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Класныя навіны

# КАБ ПАВЫСІЦЬ ДАВЕР...

**Па рашэнні Міністэрства адукацыі змяніліся правілы правядзення школьных алімпіяд. Цяпер падрыхтоўкай, захоўваннем і дастаўкай алімпіядных заданняў для трэцяга і чацвёртага (заключнага) этапаў рэспубліканскай алімпіяды зоймецца Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў (РІКВ).**

РІКВ, у прыватнасці, будзе весці ўлік аўтараў, якія маюць вопыт у распрацоўцы алімпіядных заданняў, фарміраваць электронную базу такіх заданняў па кожным вучэбным прадмеце, заключаць дагаворы на іх распрацоўку. Распрацоўшчыкі, у сваю чаргу, абавязаны будуць забяспечыць канфідэнцыяльнасць алімпіядных заданняў і іх тэматыкі з моманту пачатку работы над імі.

Не пазней чым за месяц да пачатку адпаведнага этапу рэспубліканскай алімпіяды распрацоўшчыкі прадстаўляюць заданні ў РІКВ. Тут іх тыражуюць у адпаведнасці з заяўкамі, раскладваюць у пакеты і захоўваюць. Напярэдадні алімпіяды заданні дастаўляюцца фельд'егерскай сувяззю ва ўстановы адукацыі, якія вызначаны месцам яе правядзення, і захоўваюцца ў апячатаных памяшканнях (сейфах). Распячатваюцца яны прадстаўнікамі аргкамітэта адпаведнага этапу рэспубліканскай алімпіяды толькі ў прысутнасці яе ўдзельнікаў.

Фактычна цяпер на этапе распрацоўкі, тыражавання і дастаўкі матэрыялаў школьных алімпіяд будуць выкарыстоўвацца такія ж тэхналогіі, што прымяняюцца пры арганізацыі ў краіне цэнтралізаванага тэсціравання.

Нагадаем, што ў папярэднім навучальным годзе Міністэрства адукацыі ўстанавіла парушэнні ў правядзенні рэспубліканскай алімпіяды па геаграфіі. У прыватнасці, быў пацверджаны факт уцечкі інфармацыі пра алімпіядныя заданні заключнага этапу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Самы багаты чалавек свету за суткі страціў $7 млрд

Як паведамляе тэлеканал CNBC, 24 кастрычніка інтэрнэт-кампанія Amazon дала справаздачу аб сваіх даходах у трэцім квартале, вынікі якіх расчаравалі інвестараў, што прывяло да падзення кацировак кампаніі на 6,6 %. Для Безаса, заснавальніка і кіраўніка кампаніі, якому належаць 57,6 млн акцый Amazon, такое падзенне азначае страту $6,9 млрд, паведаміў тэлеканал.

Калі каціроўкі Amazon працягнуць падаць, Безас можа саступіць Білу Гейтсу першае месца ў спісе найбагацейшых людзей свету, адзначае CNBC са спасылкай на даныя Bloomberg Billionaires Index.

На момант публікацыі багацце Безаса ацэньвалася ў 111 млрд долараў, Гейтса — 107 млрд.

Разрыў паміж Безасам і Гейтсам скараціўся летам, пасля таго як гендырэктар Amazon развёўся з жонкай. Пры разводзе Макензі Безас атрымала каля 19,7 млн акцый Amazon, што дазволіла ёй таксама патрапіць у спіс найбагацейшых людзей свету. Цяпер яна займае там 21-ы радок з 5,8 млрд долараў.

## Расія адкрыла шлях сваім кампаніям у Афрыцы

Расія, спісаўшы шматмільярдныя даўгі афрыканскім краінам, адкрыла шлях для работы сваіх кампаній на кантыненце, заявіў учора прэс-сакратар прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Пяскоў.

Раней паведамлялася, што ўвогуле Масква спісала афрыканскім дзяржавам 20 млрд долараў даўгоў за ўвесь час.

«Такі даўгавы цяжар тармазіў развіццё супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне нашых кампаній з афрыканскімі краінамі, таму што, маючы вялікую запазычанасць, кампаніі не маглі па законе ісці на нейкія новыя праекты. А так адбылася расчыстка», — растлумачыў Пяскоў. Прадстаўнік Крамля дадаў, што цяпер расійскія кампаніі маюць магчымасць працаваць у Афрыцы на ўзаемавыгаднай аснове, «зарабляць грошы, павялічваць тавараабарот, плаціць вялікія падаткі, у тым ліку ў расійскі бюджэт». «Таму гэта абсалютна ўзаемавыгадны, прадметны, прагматычны падыход да вядзення гандлёва-эканамічных сувязяў», — падкрэсліў ён.

## СМІ: Эмінема выклікалі на допыт з-за песні пра Трампа

Папулярны рэпер Эмінем не фантазіраваў, калі ў адной са сваіх песень гаварыў пра наладжаны яму агентамі сакрэтнай службы ЗША допыт з-за пагроз на адрас прэзідэнта Дональда Трампа. Пра гэта паведаміў інтэрнэт-партал BuzzFeed.



У жніўні 2018 года выканаўца выпусціў альбом Kamikaze. У адной з уключаных у яго кампазіцый пад назвай The Ringer рэпер параўнаў прэзідэнта ЗША з дэфаліянтам Agent Orange — хімічным атрутным рэчывам, якое амерыканцы выкарыстоўвалі падчас вайны ў В'етнаме, і сцвярджаў, што агенты сакрэтнай службы асабіста высвятлялі ў яго, ці не звязаны ён з тэрарыстамі і ці не выношвае якіх-небудзь каварных планаў у дачыненні да Трампа.

Сакрэтная служба, якая адказвае ў тым ліку за бяспеку першых асоб дзяржавы, летась адмовілася пракаментаваць гэтыя словы Эмінема, але BuzzFeed дабіўся ад службы пацвярджэння таго, што такая сустрэча агентаў з рэперам была. Нагодай для яе паслужыў тэкст песні Framed з альбома Revival. У сакрэтнай службе палічылі, што рэпер «паводзіць сябе непрыстойным чынам» і «пагражае асобе, якая знаходзіцца пад абаронай».

Блізкая ўлада

# Клопат пра шматдзетныя сем'і — прыярытэтная задача дзяржавы

**На прыём грамадзян да намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Мікалая СНАПКОВА ў Бялынічы запісалася шматдзетная сям'я з Віцебскай вобласці, якая апынулася ў безвыходнай сітуацыі.**



Фота БелТА.

Сям'я ў літаральным сэнсе можа апынуцца на вуліцы, бо жыллё, якое яна здымае, чужое, і яго трэба вызваліць да 1 лістапада, а рэканструкцыя свайго дома яшчэ не завершана. Справа зайшла ў тупік, паколькі выдзеленыя грошы на рэканструкцыю скончыліся, а сваіх няма. Муж працуе грузчыкам, а жонка ў адпачынку па доглядзе за дзіцем. Думалі крэдыт узяць, але ж няма з чаго яго выплачваць. У сям'і шасцёра дзяцей, пяцёра — непаўналетнія. А ўсяго ў сям'і выхоўвалася восем дзяцей, у тым ліку чацвёра чужых.

Сям'я гатова перасяліцца нават у недабудаваны дом, але ж там нават няма ацяплення. У райвыканкаме пытанне не вырашаюць. Сітуацыя, ледзь не плакала жанчына, безвыходная, таму яна і прыехала прасіць аб дапамозе вышэйшую ўладу. Мікалай Снапкоў уважліва выслухаў жанчыну і даў наступныя даручэнні — мясцовым уладам забяспечыць сям'ю часовым жыллём на перыяд правядзення рамонту, а старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалаю Шарснёву — праявіць ініцыятыву і хадайнічаць перад Прэзідэнтам аб павелічэнні субсідыі для сям'і да поўнага кошту рэканструкцыі дома.

— Падтрымка шматдзетных сем'яў — прыярытэтная задача дзяржавы, — падкрэсліў ён. — Падобны выпадак не адзінкавы. І іх трэба кропкава вырашаць, пакуль ва ўрадзе прапрацоўваюцца падыходы для больш маштабнай падтрымкі такіх сем'яў.

Наогул, з дзесяці заяўнікоў, якія запісаліся на прыём да намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, толькі двое з'яўляліся жыхарамі Бялыніцкага раёна.

Для заяўніцы з бялыніцкага аграгарадка Цяхцін у катэгорыю невырашальных трапілі два пытанні — адно датычылася працаўладкавання, другое — добраўпарадкавання мясцовай дарогі. Пясок з яе пастаянна змываецца ў двор жанчыны, прычым у вялікай колькасці. Яна прыйшла на прыём з фотаздымкамі, каб паказаць, як гэта выглядае. І сцвярджала, што пясок цягае на сметнік мяхамі. Мікалай Снапкоў даў даручэнне мясцовым камунальным службам пачысціць трубу і кантраляваць, каб пясок там не назапашваўся. Што датычыцца другога пытання, то тут крыху складаней. Тыя месцы работы, якія жанчыне прапануюць, яе не задавальняюць. І так ужо дзевяць гадоў. Або рабочае месца не задавальняе, або знаходзіцца далёка ад месца пражывання. Ёсць, напрыклад, работа ў Бялынічах, але ад аграгарадка Цяхцін да райцэнтра амаль 20 кіламетраў. Жанчына даглядае састарэлую маці і не жадае далёка ад'язджаць ад дому. Мясцовым органам улады даручана падшукаць жанчыне ў найбліжэйшы час работу, якая задаволіць яе цалкам.

Настаяцель царквы ў гонар іконы Бялыніцкай Божай Маці протаіерэй Сяргей Маслаў запісаўся на прыём, каб пахадайнічаць аб выдзяленні дапамогі на ўзвядзенне капліцы і добраўпарадкаванне Ільінскай гары ў Бялынічах да Дня беларускага пісьменства, які адбудзецца ў гэтым населеным пункце налета.

Палова заяўнікаў, як высветлілася, ужо раней звярталіся са сваімі пытаннямі да намесніка кіраўніка Адміністрацыі. У іх ліку і маладая жанчына з Мінска. Летась яна была на прыёме ў Мікалая Снапкова з нагоды выдзялення ёй з непаўналетнім сынам жылой плошчы ў інтэрнаце. Пакой выдзелены, але яе не задавальняе яго маленькая плошча і якасць. Жанчына працуе ў сістэме ЖКГ, дзе ёсць ведамаснае жыллё, якое ёй падабаецца. Але яе чамусьці не жадаюць туды перасяляць. Мінчанка спадзяецца, што намеснік кіраўніка Адміністрацыі дапаможа вырашыць пытанне.

Намесніка дырэктара адной з мінскіх будаўнічых фірмаў хвалявала пытанне рэалізацыі інвестпраекта па будаўніцтве ў раёне плошчы Бангалор у сталіцы шматфункцыянальнага комплексу. Дакументы знаходзяцца на разглядзе ў Мінскім гарвыканкаме і Адміністрацыі Прэзідэнта, але адказу няма.

З падобным пытаннем звярнуўся і кіраўнік будаўнічай фірмы з горада Горкі Магілёўскай вобласці. Летась было прынята рашэнне Мінскага аблвыканкама аб прыпыненні будаўніцтва вытворчай базы ў Заслаўі. Але будаўнікі з гэтым не згодныя.

Дзве жанчыны прыехалі з Брэста, спадзеючыся, што ім дапамогуць вырашыць праблему з узаконьваннем самавольных пабудоў на тэрыторыі іх домаўладанняў. Яны былі пабудаваныя яшчэ ў 70-я гады мінулага стагоддзя. Але нават суд не расставіў кропкі над «і».

Усе пытанні былі ўважліва выслуханыя і ўзятыя на кантроль. Па кожным з іх будуць прынятыя меры ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Марачкавай Тацццяне Барысаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МУЖА.**

# Атрымаць новую спецыяльнасць...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**У АНЛАЙН-КАНФЕРЭНЦЫІ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ:**

**начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.**

**Начальнік аддзела рынку працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алена ДАКУКІНА.**

**Рэктар Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Алег ЛІСЕЙЧЫКАЎ.**

**Начальнік упраўлення занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ.**

З менш складаных прафесій дапамагаем атрымаць навыкі адміністратара, сакратара, калькулятара і кладаўшчыка. Навучаем па спецыяльнасцях «аўтаматызацыя бухгалтарскага ўліку з выкарыстаннем праграмы «1С: Бухгалтэрыя», «офісныя інтэрнэт-тэхналогіі» і іншых.

Спіс спецыяльнасцяў, запатрабаваных на рынку працы, складае камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.

**Алег Токун:**

— У цэлым па краіне беспрацоўныя могуць прайсці перанавучанне больш чым па 100 прафесіях. Прычым каля 20 % з іх — гэта інтэграваныя прафесіі, калі чалавек адначасова атрымлівае дзве і больш спецыяльнасці — напрыклад сакратара і інспектара аддзела кадраў. Як правіла, гэта больш распаўсюджана ў рабочых прафесіях: тынкоўшчык-маляр, абліцоўшчык-плітачнік.

### Якія віды перападрыхтоўкі, навучання прапануюць мінскія гарадскія службы занятасці?

**Таццяна Кудзевіч:**

— Мы навучаем больш чым па 30 прафесіях і спецыяльнасцях. Добра супрацоўнічаем з Мінскім метрапалітэнам, «Мінсктрансам». Рыхтуем для горада кіроўцаў тралейбусаў, трамваяў, машыністаў электрацягнікоў, кантралёраў-касіраў і прадаўцоў, кухараў, кандытараў, цырульнікаў. Дарэчы, апошняя група цырульнікаў цалкам вучылася па замове наймальнікаў з гарантаваным працаўладкаваннем.

**Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Беларусі на канец верасня склаў 0,3 %. На 1 кастрычніка на ўліку ў якасці беспрацоўных знаходзілася крыху больш за 11 тысяч чалавек.**

У Мінску запатрабаваныя спецыялісты ў сферах будаўніцтва, прамысловасці, транспарту, гандлю. З'явілася і новая прафесія, па якой праводзіцца навучанне, — матарыст газонакасілкі.

Самая галоўная наша праблема — калі беспрацоўныя адмаўляюцца ад прапанаванага гарантаванага працаўладкавання. Пасля курсаў або перападрыхтоўкі ім выдаюцца дакументы аб адукацыі. Пасля гэтага яны прыходзяць да нас або самастойна займаюцца пошукам работы.

### Якую рабочую спецыяльнасць лепш абраць? Дзе назіраецца недахоп кадраў?

**Алена Дакукіна:**

— На гэты момант попытам карыстаюцца швачкі, прадаўцы, кухары, трактарысты. У сельскай мясцовасці таксама запатрабаваны муляры, жывёлаводы і электрагазазваршчыкі. Пры гэтым рынак працы і запатрабаваныя прафесіі трохі адрозніваюцца ў залежнасці ад абласцей. Напрыклад, у Брэсцкай вобласці запатрабаваная ўнікальная для краіны прафесія — грыбавод (штучнае вырошчванне грыбоў). У Гомельскай і Гродзенскай абласцях больш за ўсё патрэбны муляры, у Гродзенскай — машыністы кацельні, у Магілёўскай — электрагазазваршчыкі, у Мінску — слесары механазборачных работ.

**Больш за чатыры тысячы беспрацоўных было накіравана на перанавучанне за студзень — верасень гэтага года.**

### Куды трэба звяртацца, каб прайсці перакваліфікацыю або перападрыхтоўку?

**Алег Токун:**

— Перш за ўсё грамадзянін павінен звярнуцца ў службу занятасці па месцы свайго пастаяннага жыхарства. Там ён можа разлічваць на кансультацыю, якія прафесіі запатрабаваныя ў той мясцовасці, дзе ён пражывае, а таксама атрымаць інфармацыю, якія курсы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі магчыма прайсці ў найбліжэйшы час. Можна не прыходзіць у службу занятасці, а скарыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі на нашым партале дзяржаўнай службы занятасці альбо на старонцы канкрэтнай службы занятасці па месцы жыхарства.

**Таццяна Кудзевіч:**

— У нас у Мінску грамадзяне могуць звярнуцца ва ўпраўленне занятасці насельніцтва. Мы арыентуем грамадзян на запатрабаваныя прафесіі і спецыяльнасці, па якіх неабходна навучацца. На сайце камітэта размешчаны пералік прафесій і спецыяльнасцяў, па якіх мы праводзім навучанне: іх больш за 30. Па 13 прафесіях і спецыяльнасцях у нас беспрацоўныя ўжо прайшлі навучанне. Кожны другі з іх навучайся з гарантаваным працаўладкаваннем.

### Колькі часу зойме прафесійнае навучанне беспрацоўных? У якім фармаце арганізавана вучоба?

**Алена Дакукіна:**

— У цэлым яна можа доўжыцца да года. Але мы разумеем, што трэба значна хутчэй вярнуць беспрацоўнага на рынак працы. Чым больш аператыўна гэта адбудзецца, тым больш шанцаў, што ён працаўладкуецца і знойдзе сябе. Максімальна стараемся паскорыць працэс — навучанне займае ў сярэднім не больш за тры месяцы. Такі ж перыяд вытрымані і пры працаўладкаванні беспрацоўнага — не больш за тры месяцы. Аплата навучання не перавышае Br300 у сярэднім на аднаго беспрацоўнага. Улічваюцца індывідуальныя асаблівасці і тэрытарыяльны разрэз: хто патрэбны. Асноўны акцэнт — на патрэбы наймальніка. А арыенцір — не проста навучанне беспрацоўных, а навучанне пад заказ. Гэта гарантуе стапрацэнтнае працаўладкаванне.

**Алег Лісейчыкаў:**

— Па асобных прафесіях рабочых і служачых тэрміны падрыхтоўкі не перавышаюць трох месяцаў. Пры перападрыхтоўцы спецыялістаў на базе вышэйшай адукацыі, калі адбіраюцца людзі пад тую ці іншую групу спецыялістаў, адукацыйны працэс доўжыцца ад сямі да дзесяці месяцаў — гэта вочная форма навучання. Традыцыйна штогод у нас навучаецца ад дзвюх да трох груп спецыялістаў па адукацыйных праграмах перападрыхтоўкі. Найбольш распаўсюджаныя спецыяльнасці праграмістаў, эканамістаў, бухгалтараў і спецыялістаў па лагістыцы.

### Ці залічваецца гэты перыяд у агульны працоўны стаж?

**Алег Токун:**

— Перыяд навучання залічваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб пенсійным забеспячэнні ў агульны працоўны стаж.

### Хто мае права ў прыярытэтным парадку прайсці прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі?

**Алег Токун:**

— У першую чаргу мы прапануем атрымаць прафесію тым, у каго яе няма (гэта моладзь, людзі з абмежаванымі магчымасцямі), а таксама тым, хто ажыццяўляў догляд дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, — каб аднавіцца на рынку працы. Гэта асноўныя катэгорыі грамадзян, якім мы аддаём прыярытэт. Прыблізна палова з тых, хто праходзіць навучанне, — моладзь ва ўзросце да 30 гадоў.

### Дзе праходзіць навучанне беспрацоўных? Хто плаціць за навучанне?

**Алег Токун:**

— Як правіла, сёння навучанне праводзіцца па месцы жыхарства грамадзяніна — у райцэнтры, горадзе. Хоць ёсць, вядома, выпадкі, калі навучанне можа праходзіць і не па месцы жыхарства. Напрыклад, цяпер у Оршы набрана група для навучання спецыяльнасці «слесар рухомага саставу», а заняткі праходзяць у Гомелі, дзе ёсць навучальная ўстанова па падрыхтоўцы такіх спецыялістаў.

Цяпер мы арыентуем усе нашы тэрытарыяльныя органы на тое, каб не проста навучаць беспрацоўных. Пачынаючы навучанне, грамадзяне павінны ведаць, куды пойдуць працаваць. У цяперашні час сітуацыя па краіне такая, што крыху больш за 60 % тых, хто праходзіць навучанне, ажыццяўляюць гэта па замове наймальніка і ведаюць, дзе яны будуць потым працаваць. Напрыклад, у Мінску па такой схеме навучаюць машыністаў электрацягніка па дамове з метрапалітэнам, у Магілёве і Брэсце — кіроўцаў тралейбусаў. Распаўсюджана практыка падрыхтоўкі пад заказ наймальніка прадаўцоў, аператараў паштовай сувязі, кухараў, машыністаў кацельні — спектр прафесій шырокі. У далейшым будзем імкнуцца да 100 % навучання па заяўках наймальнікаў.

Плаціць за навучанне мясцовая служба занятасці. У перыяд навучання беспрацоўнаму выплачваецца стыпендыя, могуць быць кампенсаваныя выдаткі на праезд і пражыванне, калі навучанне праходзіць не па месцы жыхарства.

### Ці ёсць магчымасць у грамадзян, якія не стаяць на ўліку ў службе занятасці, але жадаюць знайсці работу або змяніць яе, прайсці перанавучанне? Куды ім звяртацца?

**Алег Токун:**

— У адпаведнасці з заканадаўствам аб занятасці насельніцтва, права на праходжанне падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі ці павышэнне кваліфікацыі маюць зарэгістраваныя беспрацоўныя, іншымі словамі, тыя, хто стаіць на ўліку. Ёсць яшчэ адна катэгорыя — гэта грамадзяне, якія ажыццяўлялі догляд дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Яны не могуць быць зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных, але маюць права прайсці перападрыхтоўку на тых жа ўмовах, што і беспрацоўныя. Астатнім катэгорыям грамадзян мы можам дапамагчы, аказваючы кансультацыйныя паслугі, калі яны не хочуць рэгістравацца беспрацоўнымі, і інфармацыйныя.

### Ці можна пенсіянеру прайсці перанавучанне ў службе занятасці для далейшага працаўладкавання?

**Алег Токун:**

— Пытанне заключаецца ў тым, каго мы маем на ўвазе, калі кажам пра пенсіянераў. Калі чалавеку прызначаная пенсія і ён яе атрымлівае, то ў гэтым выпадку ён не можа зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнага і не мае права на бясплатнае перанавучанне. Калі ж мы гаворым пра людзей, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, але не атрымліваюць пенсію, то мы можам іх зарэгістраваць беспрацоўнымі і накіраваць на курсы. Хачу сказаць, што апошнім часам грамадзяне старэйшых узростаў усё больш інтэнсіўна выказваюць жаданне атрымаць новую прафесію.

**Алег Лісейчыкаў:**

— Бывае, што ў групах, якія фарміруюцца па накіраванні органаў сацабароны для атрымання прафесіі альбо спецыяльнасці, людзі навучаюцца ў прыватным парадку на камерцыйнай аснове. Як правіла, такіх у групах налічваецца да трох чалавек, навучаюцца ў тым ліку і пенсіянеры. Дарэчы, мы праводзілі даследаванне ў 2016-2017 гадах у групах па навучанні прадпрымальніцкай дзейнасці. Дык вось, доля старэйшых за 45 гадоў сярод навучэнцаў склала 26 %. Як паказваюць практыка і даследаванні замежных навукоўцаў, менавіта гэтая катэгорыя і ўтрымліваецца на рынку працы, калі арганізоўвае ўласную справу.

### Як звычайна ўладкоўваюць на работу тых, хто прайшоў перападрыхтоўку? Ці могуць мне гарантаваць працаўладкаванне?

**Алег Токун:**

— Як ужо было сказана, у цяперашні час сітуацыя па краіне такая, што крыху больш за 60 % тых, хто праходзіць навучанне, ажыццяўляюць гэта па замове наймальніка і ведаюць, куды яны пойдуць працаваць. Астатнія 40 % беспрацоўных маюць права звярнуцца пасля праходжання навучання зноў да нас у службу занятасці. Як паказвае практыка, амаль 90 % з іх досыць хутка працаўладкоўваюцца па атрыманай спецыяльнасці.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**



Фота БелТА.


**Извещение о проведении 11 ноября 2019 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»**

| Предмет торгов |
|---|
| Технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники» с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212 |
| Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17 |
| Начальная цена – 1 311 841,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 131 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы: заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (покупатель) обязуется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукционных торгов возместить организатору торгов затраты за организацию и проведение аукциона. Информация о сумме затрат за организацию и проведение аукциона, подлежащих возмещению, доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы затрат за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **11 ноября 2019 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 28.10.2019 по 06.11.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-58.

**Телефоны для справок:** (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-58, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

# РАВЕСНІК ВЫЗВАЛЕННЯ

## Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — 75

**«Адразу пасля вызвалення Мінска ўсё тое нешматлікае насельніцтва і былыя партызаны прыступілі да разборкі завалаў, да ўборкі вуліц і плошчаў. Цэлых будынкаў у горадзе амаль не засталося. Мы прыводзілі ў парадак Дом прафсаюзаў — пасля Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Яшчэ не ўсё было даведзена да ладу, а экспанаты пачалі прыносіць — гэта рэчы і прадметы побыту, зброя вайны, як абаронцаў Айчыны, так і фашыстаў, мастакі прыносілі карціны... Наша сям'я працавала ў музеі ўся. Я — касірам, сястра — экскурсаводам, тата — качагарам, а мама — прыбіральшчыцай, старэйшая сястра ў гэты час была ў партызанскім атрадзе пад Беластокам. С цягам часу экспанатаў станавілася ўсё больш і і больш...» — такі ліст напярэдадні юбілею прыйшоў у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ад Лідзіі Жыткевіч, якая прымала ўдзел у стварэнні першай музейнай экспазіцыі ў кастрычніку 1944 года.**

Яшчэ на тэрыторыі Беларусі ішлі баі, а ўжо актыўна збіраліся экспанаты для будучага музея (рашэнне аб яго стварэнні было прынята Цэнтральным камітэтам КП(б)Б 30 верасня 1943 года). Камандзіры партызанскіх брыгад перадавалі дакументы, якія звязаны з дзейнасцю і жыццём народных мсціўцаў, друкаваныя і рукапісныя выданні, узоры самаробнай зброі, фатаграфіі з тлумачэннямі, дакументы і сцягі, захопленыя ў немцаў. Захаваўся тэкст радыёграмы ад 24 чэрвеня 1944 года начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху Панцеляймона Панамарэнкі камандзіру Пінскага партызанскага злучэння Васілю Каржу, у якой ён дзякуе за дасланыя ўзоры аўтаматаў і прапануе захаваць партызанскую майстэрню для музея. Праз тры месяцы пасля вызвалення Мінска ўжо пачалі працаваць дзве выстаўкі «Узбраенне беларускіх партызан» і «Бальшавіцкі друк Беларусі ў дні Вялікай Айчыннай вайны».

Сярод першых стваральнікаў былі і былыя партызаны, падпольшчыкі, франтавікі. Экспанаты дастаўляліся і з фронту, шмат супрацоўнікі паездзілі па Беларусі і не толькі. Так, з двухмесячнай камандзіроўкі ў Германію ў чэрвені 1945 года былыя партызаны — адны з першых работнікаў музея — прывезлі кіцелі, фуражкі, ордэны і медалі вышэйшых нямецкіх ваенных чыноў, фотаздымкі з альбома Гебельса, зброю, сувенір-чэрап, які стаяў як упрыгажэнне на каміне ў начальніка штаба супрацьпаветранай абароны Берліна, і сувенірную зенітную гармату, што ўпрыгожвала кабінет Германа Герынга.


Пенал Яўгена Носава.

Калі 75 гадоў таму ў фондах музея налічвалася 10 тысяч музейных прадметаў, сёння іх 112 тысяч, і збор рэліквій не спыняецца. Невыпадкова свае ўрачыстыя мерапрыемствы музей распачаў з адкрыцця выстаўкі — падзякі ўсім, хто дапамагае зберагаць памяць пра вайну.

— Гэта побач са мной плача Раіса Мікалаеўна Гайдук, ну і я разам з ёй, — хвалюецца **намеснік галоўнага захавальніка фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Галіна СКАРЫНКІНА**. — Тут дакументы, якія расказваюць пра яе бацькоў. Яе тата Мікалай Гайдук вайну сустрэў пад Беластокам, быў на фронце, адступаў, стаў партызанам атрада «Перамога» на Міншчыне. Яго жонка была фельчарам у гэтым жа атрадзе. Падчас баявога задання быў смяротна паранены...


Сваякі працягваюць перадаваць сямейныя рэліквіі.

На адкрыцці часовай экспазіцыі «Вяртаючы час» завіталі даўнія сябры музея — людзі, якія доўгія гады захоўвалі, а пасля перадалі ўстанове старыя фатаграфіі, дакументы, лісты, узнагароды герояў, а таксама бытавыя рэчы, вопратку.

Сваякі знаходзяць на экспазіцыі свае сямейныя рэліквіі, дзеляцца ўспамінамі, радуюцца, што гісторыі пра іх блізкіх сёння захоўвае і вядучы беларускі «храм памяці».

У цэнтральнай прасторы экспазіцыйнай залы ўпершыню прадстаўлены асобныя ўзоры зброі, ваенная форма, прадметы ваеннай амуніцыі і побыту, якія перадаваліся ў падарунак музею дзяржаўнымі ўстановамі, аматарамі ваеннай гісторыі, калекцыянерамі.

Наогул на гэтай экспазіцыі прадстаўлена больш за 500 музейных прадметаў, сабраных за апошнія пяць гадоў — за той час, як музей пераехаў у новы будынак па праспекце Пераможцаў. Каб звярнуць увагу на сямейныя рэліквіі, на выстаўцы музейныя работнікі падалі іх праз стылізаваныя раскрытыя старонкі фотаальбомаў.

Тут можна пабачыць матэрыялы сям'і Ніны Апелінскай — сувязной партызанскага атрада імя Бельскага і партызанскай брыгады «Дзядзькі Колі». Яе муж Аляксандр Трандафілаў — удзельнік мінскага Супраціўлення — арыштаваны ў 1942-м, у сям'і захаваліся лісты, якія ён пісаў жонцы з турмы. 2 лютага 1943 года Аляксандр Фёдаравіч быў павешаны на стадыёне «Дынама».

Асобны стэнд займаюць матэрыялы, звязаныя з вельмі прыгожай парай. Рыгор Дзідзенка перад вайной быў артыстам ансамбля песні і танца пагранвойскаў НКУС. Вайна заспела яго падчас гастроляў у Літве. Рознымі шляхамі ён прабіраўся ў Мінск да жонкі і дачушкі, што нарадзілася за два тыдні да вайны. Сужэнцы ўключыліся ў партызанскі рух, пісалі для рукапіснага часопіса «Кутузавец». Незадоўга да вызвалення Беларусі партызанскі атрад апынуўся ў коле варожай блакады. Дзідзенкі загарнулі нумары часопіса ў мешкавіну і закапалі... Пазней 9 з 13 нумароў унікальнага выдання патрапілі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. (Дарэчы, установа захоўвае багатую калекцыю партызанскага друку, музейная калекцыя рукапісных партызанскіх часопісаў мае катэгорыю гісторыка-культурнай каштоўнасці № 1 Рэспублікі Беларусь.)


Музей адкрыўся ў кастрычніку 1944 года, першыя наведвальнікі.

Спрабуем разабрацца, што за незвычайны прадмет прадстаўлены ў адной з экспазіцый — аказваецца, гэта школьны пенал, які належаў Яўгену Носаву. Разам з маці і сястрой хлопчык аказаўся ў канцлагеры пад Бранскам, дзе сям'і цудам удалося пазбегнуць расстрэлу. Вязняў вырашылі вывезці ў Германію. У дарозе ў вагоне хлопчык цяжка захварэў на тыф, разам з памерлымі іх сям'ю выкінулі на станцыі Стоўбцы. Носавы знайшлі прытулак у адной з навакольных вёсак. Яўген Іванавіч выжыў, а пасля вайны ўсё жыццё працаваў у Стоўбцах фатографам. Матэрыялы, якія раскрываюць гэту гісторыю, музейным работнікам перадалі дачка і зяць Яўгена Іванавіча...

Дзякуючы сям'і Бржусь музей атрымаў здымкі, зробленыя ў Мінску ў час вайны. Марыя Юльянаўна працавала ў лагеры для ваеннапалонных на кухні каля Чэрвенскага рынку, а яе дачка — у фотаатэлье.

Родныя зберaглі памяць пра свайго дзядулю Яўгена Міхайлавіча Зуева. Перад вайной ён скончыў 9 класаў, удзельнічаў у падрыве 19 варожых эшалонаў. Сям'я перадала музею ўзнагароды юнага партызана, а таксама яго пасляваенныя лісты з цікавымі расповедамі пра аднаўленне Мінска, Беларусі...

Кузняцовы перадалі фатаграфіі і прадметы, якія расказваюць пра лёс іх сваяка Сцяпана Іванавіча, удзельніка Першай сусветнай вайны і вольнанаёмнага цырульніка, які падчас Вялікай Айчыннай абслугоўваў на фронце салдат і афіцэраў, а таксама прадметы побыту, якія нагадваюць пра тыя часы.

За кожным дакументам ці прадметам (а гэта можа быць гармонік, жаночая сукенка ці сумачка 30—40-х гадоў, лялькі, салдацкія рэчы) стаяць асабістыя гісторыі. І музейныя работнікі ўпэўненыя, што з такіх цаглінак прыватных лёсаў складаецца гісторыя краіны.

— Ствараючы выстаўку, мы вырашылі расказаць пра тое, што не пакутуем ад музейнай цішыні, што ў нас многа гасцей (самая вялікая наведвальнасць па краіне). Мы стварылі кампазіцыю, каб паказаць гісторыю вачамі тых, хто прайшоў і перажыў тую страшную вайну, хто рос у пасляваенныя дзесяцігоддзе, і тых, хто нарадзіўся пасля вайны, — расказвае **куратар выстаўкі Наталля ФІЛІПОВІЧ**.

Інтэр'ерная экспазіцыя пабудавана з выкарыстаннем фондавай мэблі ваеннага і пасляваеннага часу. Пры афармленні залы выкарыстаны рэдкія фатаграфіі, зробленыя ўдзельнікамі вайны і ваеннымі фотакарэспандэнтамі.

У апошнія гады музейны фонд папаўняўся экспанатамі, звязанымі з медыкамі-франтавікамі. Такі матэрыял пададзены ў інсталяцыйным варыянце: наведвальнікі могуць убачыць, як выглядаў палявы армейскі шпіталь.


Сукенкі ваенных часоў — Марыі Бржусь (жыла ў акупаваным Мінску) і Валянціны Паляковай (Магнітагорск).

Таксама за апошнія пяць гадоў музею дапамагалі даследчыкі, якія займаліся ваеннай археалогіяй. Сюды перададзены знаходкі з месцаў раскопак у Нясвіжы, дзе было пахавана больш за тысячу чалавек, расстраляных у кастрычніку 1941-га, а таксама рэчы ахвяр лагера смерці Трасцянец.

Прадстаўлены на выстаўцы і карціны, серыі малюнкаў, эцюды, замалёўкі, зробленыя мастакамі ў ваенныя гады. У прыватнасці, можна пабачыць эскізы ілюстрацый, выкананых Дзмітрыем Красільнікавым для газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1941—1944 гады). Ёсць тут і карціна невядомага мастака — савецкага ваеннапалоннага лагера «Шталаг-352» каля вёскі Масюкоўшчына (1941—1942 гады). Больш за 75 гадоў яе захоўваў Аляксандр Кійранен (журналіст, каментатар Дзяржтэлерадыё БССР). Падчас вайны яго сям'я жыла на станцыі Ждановічы ў доме чыгуначніка. Аднойчы адзін з ваеннапалонных, што капалі там торф, перадаў маленькаму Аляксандру зроблены алеем пейзаж і сказаў, што гэта яго родныя мясціны. На жаль, пра лёс мастака нічога невядома...

У юбілейны дзень музей папоўніўся новымі экспанатамі. Вераніка Цімафеева перадала сямейную рэліквію: «У нас дома было вельмі многа ўзнагарод — ордэны Чырвонай Зоркі, Вялікай Айчыннай вайны, медалі «За абарону Сталінграда», «За ўзяцце Берліна». Тата прайшоў усю вайну... Але ў кватэру забраліся злодзеі і скралі ўсе ўзнагароды і дакументы, а разам з імі і частку нашай памяці. У нас засталася толькі маленькая іконачка святога Мікалая. Калі тата пайшоў у армію, бабуля паклала яе яму ў кішэню і сказала, што святы будзе дапамагаць і ратаваць. І тата з гэтай іконкай прайшоў дзве вайны, не вымаючы яе з кішэні, і вярнуўся жывы, здаровы».

Таксама ў гэты дзень цэнтральны раённы ваенны камісарыят перадаў музею баявыя ўзнагароды Героя Савецкага Саюза, калекцыянер Аляксандр Аляксеенка падарыў больш за 100 рэдкіх экспанатаў, сярод якіх ваенныя ўзнагароды, прадметы побыту, амуніцыя, форма ўзброеных сіл розных краін, а арганізацыя, якая займаецца зборам макулатуры, прынесла знойдзеныя ў кантэйнерах слоўнікі — нямецка-рускі 1941 года і руска-нямецкі 1942-га...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**


Эскізы ілюстрацый, выкананых Дзмітрыем Красільнікавым для газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну».

# ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**
Продавец: ООО «БелДрев» (УНП 500541442) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.
Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены **12 ноября 2019 г**. 09.00-17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 400/С-1104 (проходная) общей площадью 20,1 кв. м. Назначение – здание нежилое), расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, д. 2А | 10 200,00 |
| | Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 400/С-57475 (административно-бытовой и производственный комплекс) общей площадью 3059,80 кв. м. Назначение – здание многофункциональное), расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, д. 2А | 1 245 250,00 |
| | Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 400/С-60762 (склад листовых материалов) общей площадью 234,9 кв. м. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, д. 2А | 58 055,00 |
| 2 | Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 400/С-49752 (административное здание) общей площадью 432,2 кв. м. Назначение – здание административное, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, д. 22 | 227 800,00 |
| | Объект недвижимости – в составе капитального строения с инвентарным номером 400/С-28567 (проходная) общей площадью 15,2 кв. м. Назначение – здание проходной, проезжей части (А1-материал – асфальтобетон, площадь – 127,1 кв. м), пешеходной части (А2-материал – асфальтобетон, площадь 6,9 кв. м), ограждения (Б1-материал – металлическое, высота – 1,7 м, площадь – 9,2 кв. м), ворот (Б2-материал – металлические решетчатые, распашные, высота – 2,0 м, площадь – 15,70 кв. м) | 7 599,00 |
| 3 | Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 400/С-88717 (производственный корпус с хозяйственным бытовым блоком) общей площадью 3745,4 кв. м. Назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, д. 2А/1 | 1 471 350,00 |
| | Стол гидравлический СПГ 2700*2000, инв. № 2350 | 6 485,50 |
| | Стол гидравлический СПГ 2700*2000, инв. № 2254 | 6 485,50 |
| 4 | Пила диск. д\распила древесины и древесных плит-авт б\у HOLZMA «HPL11 № 477, 1999 г. в | 24 395,00 |
| 5 | Станок форматно-раскроечный HOLZMA OPTIMAT HPP 82/43 для раскр. древ. плит № 159, 2001 г. в | 29 240,00 |
| 6 | Стол резки стекла Intermac Fox Shape 3700 № 5017, 2001 г. в | 29 495,00 |
| 7 | Станок для изготовления двухконусной пружины Spuhl AM-115 инв. № 3025,1984 г. в. | 10 455,00 |
| 8 | Пескоструйный автомат СК 1600 (СК 1650), инв. № 5009, 2012 г. в. | 5 006,50 |
| 9 | Станок с ЧПУ Standart DM-1222, инв. № 5016 | 10 778,00 |
| 10 | Универсальный кромкооблицовочный станок WT-91 (MFS 503), инв. № 811, 2010 г. в. | 1 683,00 |
| 11 | Бетоносмеситель MIX 1302K 700 Вт 130 л. чугун. венец инв. № 622 | 136,00 |
| 12 | Пресс мембранный для облицовки мебельных фасадов пленкой ПВХ Itallpress Lock-Form SS Air № 3010, 2002 г. в. | 22 610,00 |
| 13 | Станок для изготовления криволинейной кромки Bavelloni SB-10 № 115 | 13 175,00 |
| 14 | Печь промышленная эл. Для мелирования стекла (для выгибания) PK-VS 1125 инв. № 2244, 2007 г. в. | 5 134,00 |
| 15 | Полуприцеп платформа тентовая Schmitz, рег. № А 9449 А-4, 1994 г. в. | 2 159,00 |
| 16 | Полуприцеп фургон тентовый Schmitz Cargobull AG S 01, рег. № 0343 В-4, 2007 г. в. | 13 751,30 |
| Местонахождение – г. Гродно, ул. Карского, д. 2А | | |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.
Для участия в торгах необходимо в срок по 11.11.2019 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов и задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 04.09.2019 г.

# Извещение о проведении 12 ноября 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЕЛРЫБА»

| № предмета торгов | Предмет торгов (наименование и состав продаваемого имущества) | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов (бел. руб., без учета НДС) | Размер задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное нежилое помещение склада общей площадью 410,4 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 640/D-29388; склад – авторефр. Н-13 Х 32-53КА; весы электронные BW 150; весы электронные BTM-300; камера КХН 31,21; кондиционер SM 226 SF (R-404A); кондиционер SB 331 SF (R-404A); кондиционер SB 331 SF (R-404A); кондиционер ACS-247 HR; контейнер холодильный CARRIER; система ком. учета электроэнергии (внутр. проводки) на складе; система КХН 6,61; система СБ 211 С; шкаф холодильный серии «Рапсодия R» 1400 М | г. Слуцк, ул. Базарная, д. 53 (складское помещение) | 98 101,78 | 9 800,00 |
| 2 | Торговое помещение (магазин) общей площадью 212,2 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 633/D-3484 (Здание магазина «Нарочь», инв. № 001.00.76.1462); бонета-ларь Crystallite 20 (инв. № 004.21.07.1991); бонета-ларь Crystallite 20 (инв. № 004.21.07.1992); бонета-ларь Crystallite 20 (инв. № 004.21.07.1993); весы электронные «Штрих-принт» Ф4, (инв. № 004.00.08.2096); витрина холодильная «Двина» 150 ВСн-0,47-1,13-1-4Х (инв. № 004.00.09.2608); витрина холодильная Двина 150 ВНУ-0,3-1-ОХ (инв. № 004.00.09.2442); воздухоохладитель EACM-90E/R (инв. № 004.04.10.3176); пожарно-охранная сигнализация Нарочь, (инв. № 004.00.08.2087); система видеонаблюдения магазин к. п. «Нарочь» (инв. № 603887); холодильная витрина 535-930-10 (инв. № 004.21.03.1552); шкаф Polair ШХ-0,7 ДСН (инв. № 004.21.07.1996); шкаф универсальный с дверью купе R1400VC (инв. № 004.00.08.2132); шкаф холодильный R1400 VS (инв. № 004.00.08.2184); шкаф холодильный R1400 VS (инв. № 004.00.08.2185) | Мядельский р-н, к п Нарочь, ул. Набережная, 15-1 | 35 571,93 | 3 500,00 |
| 3 | Агрегат И7-ИВБ/2.00.000; Бункер со шнековым дозатором; Дозатор весовой Р6-АВМ-15; Микродозатор И7-ИЖР/4А.00; Панель измерительных приборов; Пневмотранспорт И7-ИВБ/4; Ручная мешкозашивочная машина; Рыборезка Т1-ИЖС-1-01; Сепаратор ФСЦП-1/0,5; Установка мельничная И7-И; Установка насосная И7-ИЖР (2 единицы); Устройство комплектное; Цистерна д/бульона и жира; Шнек сырьевой РМУ-5.01.01; Скруббер стеклопластиковый СПК-Б-1-100, Украина | г. Минск, пер. Стебенева, 2 | 264 156,26 | 26 400,00 |
| 4 | Автомат упаковочный вертикальный ВАЭМ-1 с мультиголовочным дозатором, инв. № 120853 | | 31 618,76 | 3 100,00 |
| 5 | Весы Bizerba, инв. № 603763 | | 1 251,00 | 125,00 |
| 6 | Витрина холодильная «Нарочь» 1150 ВСн-0,47-1,13-1-4Х, инв. № 004.00.09.2701 | | 1 437,01 | 143,00 |
| 7 | Витрина холодильная «Нарочь» 180 ВН-0,63-1,47-1-0О, инв. № 004.00.09.2816 | | 2 265,80 | 226,00 |
| 8 | Витрина холодильная ВХС 1,5/1,1 М, инв. № 004.00.08.2124 | | 1 491,11 | 149,00 |
| 9 | Витрина холодильная ВХС 1,5/1,1 М, инв. № 004.00.08.2129 | | 1 087,03 | 108,00 |
| 10 | Головоотсекающая машина, инв. № 2017 | | 23 409,00 | 2 300,00 |
| 11 | Две единицы автоклава в одном модуле (2133/2134), инв. № 2133 | | 107 649,00 | 10 700,00 |
| 12 | Дозатор TG2/150, инв. № 2454 | | 42 363,00 | 4 200,00 |
| 13 | Дозировочно-перекручивающий автомат с формовщиком фрикаделек, инв. № 2076 | | 27 901,01 | 2 700,00 |
| 14 | Инъектор для посола (ручной) ПМ-ФМШ-05, инв. № 603862 | | 1 139,00 | 113,00 |
| 15 | Ленточная пила для мяса K 330 K 330S, инв. № 2194 | | 4 417,03 | 441,00 |
| 16 | Машина для закатки банок, модель MVT-34/3, инв. № 2121 | | 2 957,36 | 295,00 |
| 17 | Машина для снятия кожицы с овощей, инв. № 2448 | | 9 837,00 | 983,00 |
| 18 | Машина фасовочно-упаковочная модели «ПАСТПАК-Р2», инв. № 007.14.09.2702 | | 27 492,23 | 2 700,00 |
| 19 | Моечные машины для овощей модель ATIR III, инв. № 2093 | | 6 237,00 | 623,00 |
| 20 | Мойка, инв. № 2097 | | 978,53 | 97,00 |
| 21 | Напольные весы с въездной рампой 1500 кг, инв. № 2014 | | 10 010,21 | 1 000,00 |
| 22 | Напольные весы с въездной рампой 1500 кг, инв. № 2393 | | 10 010,21 | 1 000,00 |
| 23 | Настольный дозатор пряного солевого раствора, инв. № 120695 | | 5 792,51 | 579,00 |
| 24 | Овощерезка, инв. № 2094 | | 6 193,67 | 619,00 |
| 25 | Овощерезка, инв. № 2447 | | 4 510,21 | 451,00 |
| 26 | Опрокидывающаяся жарочная установка (Опрокидывающаяся сковорода), инв. № 2068 | | 13 581,35 | 1 300,00 |
| 27 | Опрокидывающаяся жарочная установка (Опрокидывающаяся сковорода), инв. № 2069 | | 13 581,35 | 1 300,00 |
| 28 | Опрокидывающий варочный котел, инв. № 2418 | | 23 956,34 | 2 300,00 |
| 29 | Опрокидывающий варочный котел, вариант отопления паром, инв. № 2070 | | 24 447,74 | 2 400,00 |
| 30 | Опрокидывающий варочный котел, вариант отопления паром, инв. № 2071 | | 23 956,07 | 2 300,00 |
| 31 | Слайсер S.A.M. 308 CS, инв. № 120697 | | 10 907,74 | 1 000,00 |
| 32 | Установка для потрошения рыбы, инв. № 2041 | | 8 874,00 | 887,00 |
| 33 | Установка для сухой панировки для нанесения стандартных сортов панировочной муки, инв. № 2199 | | 13 436,81 | 1 300,00 |
| 34 | Установка для сырой панировки, инв. № 2197 | | 11 339,40 | 1 100,00 |
| 35 | Устройство для мягкой нарезки лосося, инв. № 2487 | | 63 452,51 | 6 300,00 |
| 36 | Устройство для нарезки полосками для листовых овощей, инв. № 2088 | | 7 658,19 | 765,00 |
| 37 | Устройство для нарезки полосками для листовых овощей, инв. № 2414 | | 8 371,14 | 837,00 |
| 38 | Устройство мягкой нарезки лосося модель WSM 100 D/A, инв. № 603836 | | 56 513,13 | 5 600,00 |
| 39 | Филетировочная машина 1968 для мелкой рыбы, инв. № 2019 | | 22 469,68 | 2 200,00 |
| 40 | Флюкс-эксцентрический винтовой насос для насадки на 200 литровую стандартную тележку, инв. № 2441 | | 2 889,00 | 288,00 |
| 41 | Чекопечатающее устройство, инв. № 2486 | | 1 251,00 | 125,00 |
| 42 | Чекопечатающее устройство (цифровые весы), инв. № 2225 | | 1 251,00 | 125,00 |
| 43 | Чекопечатающее устройство (цифровые весы), инв. № 2224 | | 1 251,00 | 125,00 |
| 44 | Чешуесъемная машина, инв. № 2029 | | 630,00 | 63,00 |
| 45 | Чешуесъемная машина, инв. № 2028 | | 630,00 | 63,00 |
| 46 | Шкуросъемная машина для сельди/соленой рыбы, инв. № 2406 | | 6 382,01 | 638,00 |
| 47 | Электронный уничтожитель, инв. № 2519 | | 249,46 | 24,00 |
| 48 | Электронный уничтожитель, инв. № 2518 | | 249,46 | 24,00 |
| 49 | Этикетировочная машина, автомат, предназначена для банок с резьбовыми крышками, цилиндрические – для СА, инв. № 2461 | | 32 113,91 | 3 200,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «БЕЛРЫБА», пер. Стебенева, 2, 220024, г. Минск (017) 365-79-24.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.
**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛРЫБА», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.
Торги проводятся **12 ноября 2019 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 28.10.2019 по 06.11.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
**Телефоны для справок**: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 365-70-90 (ОАО «БЕЛРЫБА»).

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД»

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-88689 (наименование: пристройка к жилому дому; назначение: помещение неустановленного назначения), площадью 828,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. М. Л. Мошенского, д. 92, пом. 121 | **253 000,00** | **25 300,00** |

**Продавец:** ОАО «Брестский электротехнический завод», г. Брест, ул. Строительная, 56, УНП 200215500. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», Брестский филиал.
Р/сч для перечисления задатка: BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10 BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.
**Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Условия оплаты: в соответствии с заключенным договором купли-продажи. Условия продажи: без условий. **Обременения:** наличие действующих договоров аренды

**Аукцион состоится 26 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10–325**
**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Перечень документов для участия в аукционе и иную информацию можно узнать по телефонам: 8 (0162) 20-92-13; 21-88-81; 8 029 626 72 52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 25 ноября 2019 г. до 17.00**

**Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, а также возмещает затраты Организатору аукциона**

**Организатор аукциона ООО «Зовель», г. Минск, ул. Скрыганова, 6, корп. 2, каб. 310.** Продавец ООО «Европицца», г. Минск, ул. Жуковского, д. 1, комн. 8. Предмет торгов – Недвижимое имущество, расположенное по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, военный городок № 1. Наименование (назначение) – капитальное строение с инвентарным номером 602/С-1813, площадью 4021,9 кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – здание казармы № 1/41. Начальная цена без учета НДС: 33 900,00 белорусских рублей. Шаг аукциона: 1 695,00 белорусских рублей. Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,2618 га, предоставлен Продавцу на праве аренды для обслуживания здания казармы. Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Буглак Екатерина Андреевна, контактный телефон +375 (29) 179-02-40. Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на BY53IRJS30120021901000000933 в ОАО «СтатусБанк», г. Минск, код IRJSBY22, УНП 191444420, получатель платежа ООО «Европицца». Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов. **Условия оплаты предмета электронных торгов.** Победитель торгов либо единственный участник торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов. Победитель торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить Организатору торгов затраты на их проведение, а также возместить Продавцу затраты по публикации извещений в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов. Организатор торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия. Дата, время и место проведения электронных торгов: 27.11.2019 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, корп. 2, каб. 310. Дата и время окончания приема документов: 25.11.2019 до 17.00 по электронной почте zovel@tut.by. Контактные телефоны: +375 (17) 259-17-55; +375 (29) 179-02-40. E-mail: zovel@tut.by

# НЕ ЎСЕ ХВАРОБЫ АД НЕРВАЎ

**Адпачынак, як той казаў, час курортных раманаў. На жаль, амаль кожны другі з іх мае працяг... у кабінеце венеролага. Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, штодзень на планеце адбываецца больш за мільён выпадкаў заражэння інфекцыямі, якія перадаюцца палавым шляхам (ІППШ). Вядома, што такім чынам можна «падхапіць» больш за 30 розных бактэрый, вірусаў і паразітаў. Паводле ацэнак, штогод фіксуецца 376 мільёнаў новых выпадкаў заражэння адной з чатырох інфекцый — хламідыёзам, ганарэяй, сіфілісам ці трыхаманіязам. Каля 50 працэнтаў насельніцтва хоць аднойчы хварэлі на інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам. Як ІППШ нярэдка становяцца выпадковай знаходкай медыкаў, чаму ў нашай краіне істотна знізілася захваральнасць на сіфіліс, а таксама ў чым небяспека схаваных інфекцый, расказаў загадчык амбулаторна-дэрматавенералагічнага аддзялення № 4 Гарадскога клінічнага скурнавенералагічнага дыспансера Мінска Уладзімір ЯРОМІЧ.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

rufor.org

## Выпадковая «знаходка»

**— Уладзімір Іванавіч, калі лета — час адпачынкаў, то адпаведна восень — гарачая пара ў венеролагаў?**

— Сапраўды, восенню пацыентаў крыху больш — хтосьці вяртаецца з адпачынкаў, нехта праходзіць медагляд. Але не настолькі, як было раней, бо цяпер адпачынак больш даступны ў розных краінах у любы час года, а не толькі летам.

**— Беларусы прывозяць экзатычныя інфекцыі з экзатычных краін?**

— Інфекцыі ўсюды аднолькавыя, проста ў некаторых краінах тыя ці іншыя захворванні, напрыклад сіфіліс, больш распаўсюджаны. І сіфіліс, і ганарэю прывозілі і з Тайланда, і з іншых краін.

**— Якія інфекцыі распаўсюджаны ў нас?**

— Як і раней, самая «злая» інфекцыя — сіфіліс, ганарэю мы таксама пакуль з рахункаў не спісваем. Але дамінуюць цяпер не класічныя венерычныя хваробы, а інфекцыі, што перадаюцца палавым шляхам і могуць працякаць (і даволі часта працякаюць) схавана. Гэта захворванні, якія выклікаюць хламідыі і mycoplasma genitalium. Ёсць яшчэ ўмоўна-патагенныя інфекцыі — мікаплазмозы, якія ў пэўных сітуацыях могуць выклікаць тыя ці іншыя клінічныя праявы. Яны патрабуюць лячэння толькі ў пэўных сітуацыях. У норме гэтыя мікробы могуць прысутнічаць у арганізме ў мізэрнай колькасці. Умяшанне патрабуецца, калі іх колькасць сур'ёзна павялічваецца. На гэта могуць паўплываць пераахаладжэнне, перагрэў, стрэсавыя сітуацыі, наяўнасць цукровага дыябету, аперацыйнае ўмяшанне ці прыём лекавых сродкаў — прычын шмат. Часам пацыента прыводзяць да венеролагаў ці да гінеколагаў і ўролагаў нейкія скаргі. А нярэдка ІППШ выяўляецца як выпадковая знаходка, калі пацыент праходзіць абследаванне з іншай нагоды.

**— Даводзілася чытаць, што хламідыёз ледзь не другая пасля грыпу па распаўсюджанасці інфекцыя...**

— Гэта зусім не так. Бо, па-першае, перадаецца ён не так проста, як грып, калі чалавек чхнуў і пяць-шэсць навакольных могуць захварэць. Па-другое, дзякуючы нашай імуннай сістэме не заўсёды аднаразовы кантакт з заведама хворым партнёрам вядзе да заражэння. Рызыка — ад 20 да 80 працэнтаў. Гэта залежыць ад таго, якая інфекцыя, мужчына ці жанчына яе носьбіт і ад мноства іншых фактараў.

**— Каму лягчэй перадаецца інфекцыя?**

— Жанчыны рызыкуюць больш па прычыне анатама-фізіялагічнай будовы.

**— Як распазнаць у сябе прыкметы інфекцыі?**

— Ад 40 да 60 працэнтаў некаторых інфекцый першапачаткова могуць працякаць схавана і ніяк не праяўляць сябе даволі працяглы тэрмін — месяцы і нават гады. І будуць знойдзены выпадкова. Ёсць агульныя сімптомы, характэрныя для большасці захворванняў: высыпанні ці пачырваненні ў вобласці геніталій, павелічэнне рэгіянальных лімфатычных вузлоў, часцей за ўсё пахвінных, непрыемныя адчуванні падчас ці пасля мочаспускання, сверб, нетыповыя выдзяленні з мочапалавых органаў. У жанчын могуць быць боль унізе жывата, крывяністыя выдзяленні паміж месячнымі. Калі штосьці з названага з'явілася, гэта нагода пайсці да ўрача ці абследавацца ў медыцынскім цэнтры на ІППШ. Яшчэ адна нагода для абследавання — наяўнасць мноства палавых партнёраў.

**— Пры сімптомах некаторыя вырашаюць проста папіць антыбіётык і не звяртацца да ўрача...**

— Мікраарганізмаў мноства: прасцейшыя, мікробы, грыбы, вірусы. Антыбіётык уздзейнічае не на ўсіх узбуджальнікаў. Такім чынам інфекцыю можна прыглушыць, а не вылечыць. Акрамя таго, важна правільна падабраць не толькі прэпарат, але і дозу: разавую, сутачную і курсавую. А пасля заканчэння лячэння рэкамендуецца правесці кантроль. Калі першапачаткова не вызначана, што стала ўзбуджальнікам інфекцыі, то як кантраляваць гэта пасля лячэння? Таму няправільна самастойна прызначаць сабе антыбіётык. Ёсць метады прафілактыкі, аднаразовы прыём медыкаментаў пасля кантакту, так званая тэрапія адчаю. Але яе прызначае ўрач індывідуальна, пасля таго як ацэніць рызыкі.

**— Як хутка ў такім выпадку трэба прыйсці на прыём?**

— Чым раней, тым лепш. Праз тыдзень пасля кантакту гэта ўжо не мае ніякага сэнсу. У ідэале трэба звярнуцца ў першыя суткі. Прызначаецца некалькі прэпаратаў, бо трэба аказаць уздзеянне на некалькі магчымых узбуджальнікаў інфекцый. Таму гэта не метад для пастаяннага і тым больш для самастойнага карыстання.

**— У якасці меры прафілактыкі пасля кантакту выкарыстоўваюць яшчэ і спрынцаванне антысептыкамі...**

— Наконт гэтага таксама лепш звярнуцца да ўрача. У некаторых выпадках такі метад можа спрыяць таму, што інфекцыя распаўсюдзіцца глыбей. Важна не толькі правільна выбраць раствор, але і высветліць, ці падыходзіць сам метад. Бо гэтай працэдурай можна як дапамагчы, так і нашкодзіць.

## Скрынінг стаў больш даступны

**— Куды варта звяртацца, каб прайсці абследаванне на ІППШ? Ці можна гэта зрабіць не ў скурвендыспансеры, а ў паліклініцы?**

— Цяпер скрынінг стаў больш даступны. Абследаванне можна прайсці ў паліклініцы па месцы жыхарства, у скурвендыспансеры ці прыватных медыцынскіх цэнтрах. Апошнія маюць ліцэнзіі, працуюць па вызначаных тэст-сістэмах. Ва ўролага ці гінеколага гэта таксама магчыма: робіцца забор матэрыялу, які затым адвозяць і даследуюць у лабараторыях. Але лепш звяртацца да ўрача-венеролага.

**— У дзяржаўных установах такія аналізы платныя?**

— Пэўны аб'ём абследаванняў выконваецца бясплатна. Ёсць клінічныя пратаколы, загады Міністэрства аховы здароўя і Камітэта аховы здароўя, яны вызначаюць катэгорыі пацыентаў і аб'ём медыцынскай дапамогі, які ім аказваецца бясплатна. Напрыклад, цяжарным жанчынам аднаразова праводзіцца бясплатны скрынінг на ўсе схаваныя інфекцыі. Абследаванні на ганарэю і сіфіліс падчас цяжарнасці праходзяць некалькі разоў, таксама за бюджэтны кошт. Пры наяўнасці пэўных іншых паталогій таксама некаторыя аналізы робіцца бясплатна. Ганарэя, сіфіліс, хламідыёз, мікаплазмоз, выкліканы mycoplasma genitalium, — тыя хваробы, узбуджальнікі якіх з'яўляюцца патагеннымі для чалавека, і пры наяўнасці паказанняў (выдзяленні, павышэнне лейкацытаў, якія сведчаць пра запаленне, і іншага) яны выконваюцца бясплатна. Умоўна-патагенная флора вызначаецца толькі на платнай аснове.

**— Аналіз на вірус папіломы чалавека, які, як вядома, выклікае ў жанчын рак шыйкі маткі, трэба рабіць за ўласныя сродкі?**

— Ёсць пералік катэгорый і дыягназаў, пры якіх гэты аналіз робіцца бясплатна. Напрыклад, пры наяўнасці кандылом, пры дысплазіі шыйкі маткі, пацверджанай цыталагічна, для цяжарных жанчын. Калі паказанняў няма, то яго можна зрабіць за ўласныя сродкі.

**— Ці можна вылечыць вірус папіломы чалавека?**

— Спецыфічнага лячэння супраць яго не існуе. Ёсць метады карэкцыі, у тым ліку імуннай сістэмы. Калі яго выявілі, асабліва штамы высокай канцэрагеннай рызыкі, жанчына мусіць рэгулярна назірацца ў гінеколага і рабіць дадатковыя абследаванні.

**— У невялікіх гарадах ці вёсках, дзе няма скурвендыспансераў, да якога ўрача трэба звяртацца?**

— Калі няма дыспансера, у паліклініцы можа быць скурвенкабінет ці ўрач-дэрматавенеролаг. Калі няма такога спецыяліста, пацыента накіроўваюць на наступны ўзровень — міжраённы, абласны. Калі паказана абследаванне, хворы без яго не застанецца.

**— Як часта трэба абследавацца?**

— Усё гэта індывідуальна. Калі ў вас некалькі партнёраў, абследавацца варта сістэматычна. Калі ж вы ніколі не праходзілі абследаванне, то хоць бы самы просты скрынінг таксама трэба зрабіць. Усё залежыць ад ладу жыцця. Аб'ём абследавання прызначае ўрач, трэба спачатку прыйсці да яго на прыём, затым здаваць аналізы.

## Перамагчы не ўдасца

**— У чым небяспека схаваных інфекцый?**

— Любы ачаг інфекцыі ў арганізме найперш уплывае на імунную сістэму. Ён здольны выклікаць абвастрэнне хранічных захворванняў. Таксама інфекцыя можа прыводзіць да хранічных хвароб органаў малога тазу ў жанчын, у тым ліку запаленчых, і выклікаць ускладненні аж да бясплоддзя. Згодна са статыстыкай, у нас кожны шосты шлюб бяздзетны. Прычыны гэтага працэнтаў на 25, а па некаторых звестках і да 40, звязаны з інфекцыяй, на якую хварэе адзін з палавых партнёраў.

**— Якія інфекцыі найбольш небяспечныя?**

— Усе тыя інфекцыі, якія выклікаюць мікраарганізмы, патагенныя для чалавека, у выпадку выяўлення патрабуюць лячэння. Безумоўна, венерычныя хваробы — сіфіліс і ганарэя — самыя небяспечныя. Яны ўваходзяць у пералік сацыяльна небяспечных захворванняў.

**— Згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у нашай краіне стаіць задача ўзяць пад кантроль тыя ж туберкулёз і ВІЧ. А перамагчы ганарэю і сіфіліс не атрымаецца?**

— Цалкам пабароць інфекцыі не ўдасца. Яны існуюць ва ўсім свеце — у той ці іншай ступені выяўленасці. Але мы не на лідарскіх пазіцыях. Згодна з даследаваннем Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, якое праводзілася з 2000-га да 2013 года, сярод 53 краін Еўрапейскага рэгіёну мы ўваходзілі ў пяцёрку лідараў толькі па папіломавірусе і ганарэі. Па тым жа сіфілісе Беларусь ужо тады не ўвайшла ў пяцёрку. Мы пастаянна змагаемся з гэтымі інфекцыямі, з кожным годам захваральнасць, асабліва на сіфіліс, усё ніжэй. Тры гады таму атрымалі ад Сусветнай арганізацыі аховы здароўя сертыфікат аб ліквідаванні вертыкальнага (ад маці да дзіцяці) шляху перадачы гэтага захворвання. Яно застаецца на жорсткім кантролі: усіх хворых мы бяром на дыспансерны ўлік, назіраем, працуем з імі ад аднаго да некалькіх гадоў. Дагэтуль у нас усе, хто трапляе ў любы стацыянар для аперацыйнага ўмяшання, праходзяць абследаванне на сіфіліс. Па клінічных паказаннях практычна ўсе абследуюцца на сіфіліс, гэтак жа як і пры найме на работу, падчас пярвічнага медагляду. Дзякуючы таму, што ў нашай краіне ўдалося захаваць сістэму татальнага скрынінгу, мы дасягнулі добрых вынікаў. У год мы маем усяго 70—80 выпадкаў. На сёння захваральнасць па Мінску складае 2,5 выпадку на 100 тысяч насельніцтва, прытым што ў 1996 годзе гэты паказчык складаў больш за 300 выпадкаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 38 (480)

Культасвета

# ПАД ГУКІ ПАЛАНЭЗА

**«Венскі баль у Купалаўскім», які пройдзе 14 снежня ў цэнтры сталіцы, адкрые знакаміты паланэз Агінскага «Развітанне з Радзімай». Па традыцыі, менавіта паланэзам у выкананні дэбютантаў распачынаюцца падобныя імпрэзы як у Аўстрыі, так і ў іншых краінах свету. У Беларусі за музычнае суправаджэнне вечара адказвае Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр, што ўжо рыхтуе разнастайныя вальсы, полькі, мазуркі і іншыя мелодыі, пад якія будуць танцаваць госці.**

Дарэчы, арганізатары «Венскага балю з А1 у Купалаўскім» атрымалі звыш 600 заявак ад ахвотных стаць дэбютантамі — хлопцаў ва ўзросце 18—26 гадоў і 16—23-гадовых дзяўчат. Цяпер перад бальным камітэтам стаіць задача вызначыць 200 удзельнікаў вочнага этапу адбору. А зрабіць гэта будзе няпроста, бо сярод кандыдатаў — вельмі цікавыя маладыя людзі: байкеры і выхавальнікі, урачы і мадэлі Нацыянальнай школы прыгажосці, лаўрэаты міжнародных музычных конкурсаў, інжынеры-энергетыкі... Пераважная большасць сярод тых, хто жадае трапіць на баль, — дзяўчаты, расказалі арганізатары праекта. Каля паловы кандыдатак атрымліваюць вышэйшую адукацыю, а ў вольны час не толькі вядуць здаровы лад жыцця, але і захапляюцца мастацтвам, наведваюць выстаўкі, спектаклі і канцэрты, ведаюць, хто такі Бэнксі, і ўмеюць адрозніваць Гегеля ад Гогаля. Сярод прэтэндэнтак ёсць, напрыклад, пяціразовая стыпендыятка спецфонду Прэзідэнта па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, піяністка — лаўрэат міжнародных музычных конкурсаў, некалькі валанцёраў ЮНІСЕФ, будучая валанцёрка на Алімпійскіх гульнях — 2020 у Лондане. Што да юнакоў, якім цікавы баль, сярод іх прыкладна пароўну прадстаўнікоў тэхнічных і творчых прафесій, а таксама ёсць некалькі афіцэраў Узброеных Сіл і ўдзельнік гістарычных рэканструкцый напалеонаўскіх войнаў.

Ужо вядома, што выкладаць маладым беларусам майстэрства танца будзе прафесар Томас Шэфер-Эльмаер, які прыедзе ў нашу краіну з дапамогай пасольства Аўстрыі ў Беларусі. Танцавальная дынастыя Эльмаер ужо сто гадоў кіруе аднайменнай школай танцаў, папулярнай па ўсёй краіне, адказвае за цырымонію адкрыцця на больш чым 50 штогадовых балях Вены і знаёміць дэбютантаў не толькі з правільнай танцавальнай тэхнікай, але і з адмысловым этыкетам.

Квіткі на «Венскі баль з А1 у Купалаўскім» з'явяцца ў продажы ўжо ў пачатку лістапада (акрамя набыцця білета, нагадваюць арганізатары, трэба вытрымаць абавязковы дрэс-код: Black Tie для мужчын, доўгая бальная сукенка для жанчын). А ўбачыць імпрэзу, нагадаем, змогуць нават тыя, хто на яе не трапіць, прычым бясплатна — у прамым эфіры на лічбавай платформе VOKA.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Выстаўка

# СУПРЭМАТЫЧНАЯ І РЭАЛЬНАЯ НАДЗЕЯ

## Як вясковая дзяўчына з Беларусі скарыла Парыж

Па-першае, яна не баялася марыць — і яшчэ падлеткам збегала з дому, каб дабрацца туды, куды ў пачатку XX стагоддзя імкнуліся ўсе мастакі. І не важна, што родная вёска была на Віцебшчыне, — калі моцна хочаш, усё атрымаецца. Так і здарылася для Надзі Хадасевіч, прозвішча якой загучала ў мастацкім свеце дзякуючы авангарднаму кірунку, што яе вельмі захапіў, — гэта па-другое. Адкрыўшыся рэвалюцыйным плыням у мастацтве, яна была паслядоўная, упартая ў сваіх поглядах і мэтах, а таксама па-беларуску працавітая, праз што здабыла павагу і любоў мэтра французскага мастацтва Фернана Лежэ. Але калі б да імені Надзеі Хадасевіч не далучылася прозвішча чалавека, які стаў яе мужам, яе творчасць усё адно была б дарагая нам: беларуская мастачка, адна з прадстаўнікоў так званай парыжскай школы, цікавая сваім адметным поглядам і творчымі прынцыпамі. Пра гэта сведчыць выстаўка «Надзя. Да 115-годдзя з дня нараджэння Надзеі Хадасевіч», арганізаваная ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі пры падтрымцы пасольства Францыі ў нашай краіне.



Аўтапартрэт. Надзя-канструктывістка. 1973 г.

Супрэматычная кампазіцыі — вынік захаплення ідэямі Малевіча: падчас вучобы ў Смаленску зусім юная Надзя даведалася пра УНОВІС і горача прыняла рэвалюцыю ў мастацтве, калі вучылася ва Уладзіслава Стржэмінскага. Але не пагадзілася з Малевічам у тым, што жывапіс сваё аджыў: як жа так, калі для яе ўсё толькі пачынаецца?.. Тым больш што рэвалюцыя, якая адбылася ў грамадстве, адкрыла новыя магчымасці для простых людзей, да якіх належала і шматдзетная сям'я бацькоў Надзі. Яны ніяк не маглі зразумець, чаго дачцэ не сядзіцца дома, навошта ёй нейкі далёкі Парыж і што гэта за прафесія для дзяўчыны — мастак. А яна верыла, што не толькі ідэі, але і мастацтва можа пераўтварыць свет. Вынік бачым на выстаўцы: шмат супрэматычных кампазіцый, дзе сярод геаметрычных фігур часам упісаны партрэт Леніна. У гэтым таксама была Надзя — у прыхільнасці, адданасці ідэі, якую яна пранясе праз усё жыццё. Каб зразумець тую эпоху, склад мыслення тагачасных людзей, трэба глядзець гэтыя работы.

Нават калі стане прызнанай мастачкай, вядомай парыжанкай, творы якой удзельнічаюць у выстаўках і маюць поспех, яна будзе захоўваць вернасць ідэалам рэвалюцыі (сваёй?), уступіць у шэрагі Французскай камуністычнай партыі. Магчыма, гэта давала ёй адчуванне сувязі з радзімай, якую яна пакінула назаўсёды, але часткай якой заставалася да канца сваіх дзён.

